# Фотагалерэя




Удзельнікі навуковага таварыства вучняў “КВАНТ”



Школьная навукова-практычная канферэнцыя 2012 год



Каманда Даўгінаўскай СШ на раённай
навукова-практычнай канферэнцыі 2012 год




Удзельнікі конкурсу даследчых работ вучняў устаноў адукацыі
Мінскай вобласці 2012 год

# Фотарэпартаж аб школьнай навукова-практычнай канферэнцыі 2013 года

# “Думай! Твары! Даследуй!”



Журы канферэнцыі



Выступ Седай Дзіяны “Соль: карысць або шкода?”



Выступ Валковіча Алега “Дэкаратыўны кролік”



Дэманстрацыя Ўласцівасцей вады Гапановічам Яўгенам



Расказ Сяліцкага Андрэя аб рухавіку Стырлінга



Дэманстрацыя левітацыі Садоўскім



Паказ выпрацаваных мадэляў Давідовічам Уладзіславам



Прадстаўленне выкарыстання трохвугольнікаў Міцурам Уладзіславам



Асаенка Ганна: дабро і зло ў творах рускай літаратуры

Паказ работы дыстанцыйнай мышкі Яскевічам Дзянісам



Выступ Ляшковіч Кацярыны аб Нацыянальным парку “Нарачанскі”





Завяршылася канферэнцыя ўручэннем пахвальных лістоў

## 30-31 студзеня 2016 г. ў Мінскам абласным інстытуце развіцця адукацыі адбыўся VII абласны турнір юных фізікаў, у якім прынялі ўдзел 14 каманд

У турніры прыняла ўдзел каманда Вілейскага раёна, якая выступіла паспяхова і заваявала Дыплом III ступені.

Турнір сабраў 70 аматараў фізікі - навучэнцаў 8-11 класаў устаноў адукацыі Мінскай вобласці, якія дэманстравалі свае рашэнні турнірных задач, паказвалі майстэрства вядзення дыскусіі, уменне адстойваць свой пункт гледжання.

Ацэньвала працу каманд кампетэнтнае журы ў склад якога ўвайшлі выкладчыкі, аспіранты, студэнты фізічнага факультэта, факультэта радыёфізікі і кампутарных тэхналогій БДУ, удзельнікі міжнародных турніраў юных фізікаў.



Каманду Вілейскага раёна прадстаўлялі навучэнцы нашай школы Міцура Уладзіслаў, Пратасевіч Аляксандр, Яскевіч Дзяніс (капітан каманды) і навучэнцы ДУА "Вілейская гімназія № 1 “Логас” Жаўняровіч Антон, Запустас Яўген, Міхалёў Андрэй. Кіраўнікі каманды − Малашэвіч Уладзімір Лявонцьевіч і Мароз Яўген Георгіевіч.

# 23 студзеня 2016 года адбыўся V раённы конкурс работ даследчага характару малодшых школьнікаў "Я - даследчык"

Гэта навуковае мерапрыемства па добрай традыцыі праходзіла ў дзяржаўнай установе адукацыі "Сярэдняя школа № 3 г. Вілейкі".



Усяго ў вочным этапе прынялі ўдзел 25 работ вучняў пачатковых класаў.

Па выніках працы секцыі “Прыродазнаўства. Жывая прырода” Дыплом III ступені заслужыў навучэнец 1 класа Даўгінаўскай сярэдняй школы Антон Сакалоўскі з работай “Ці ёсць сваякі ў дыназаўраў?” (кіраўнік Науменка Ганна Іванаўна).



Ва ўрачыстай абстаноўцы начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Вілейскага райвыканкама А.Ч. Пуцэйка ўручыў усім дзецям, удзельнікам конкурсу даследчых прац малодшых школьнікаў “Я – даследчык”, дыпломы і пахвальныя лісты, а таксама падарункі ад заснавальнікаў конкурсу.

**21.12.2015 у нашай школе праведзены школьны этап конкурсу даследчых работ малодшых школьнікаў "Я - даследчык"**

Навучэнец 1 класа Сакалоўскі Антон у сваёй працы “Ці ёсць сваякі ў дыназаўраў?” (кіраўнік Навуменка Ганна Іванаўна), параўнаўшы сучасных жывёл і птушак з дыназаўрамі, пацвердзіў гіпотэзу пра тое, што ў наш час існуюць жывёлы - сваякі дыназаўраў. Яму атрымалася высвятліць, што блізкімі сваякамі з’яўляюцца кракадзілы і птушкі. Антон лічыць, што разгледжаная ім тэма вельмі цікавая і ўтойвае ў сабе шмат загадак.





А навучэнка 4 класа Паўлоўская Сняжана прадставіла працу “Уплыў музыкі на здароўе і навучанне дзяцей малодшага школьнага ўзросту” (кіраўнік Седая Ірына Казіміраўна). Правёўшы даследаванне і супаставіўшы ўсе дадзеныя, яна прыйшла да высновы, што музыка сапраўды станоўча ўплывае на здароўе вучняў класа, іх паспяховасць і эмацыйны стан.

Дзеці годна прадставілі свае працы. Пададзены заяўкі для ўдзелу ў раённым конкурсе даследчых работ малодшых школьнікаў “Я – даследчык” .Жадаем поспехаў нашым маленькім даследчыкам!

## 30-31 кастрычніка 2015 гада ў Мінскім абласным інстытуце развіцця адукацыі прайшоў XVIII конкурс работ даследчага характару навучэнцаў устаноў адукацыі Мінскай вобласці.

Вілейскі раён на конкурсе прадстаўлялі чатыры навучэнцы. У секцыі “Фізіка і астраномія” вучань 10 класа Даўгінаўскай сярэдняй школы Яскевіч Дзяніс пазнаёміў з вынікамі калектыўнага даследавання “Атрыманне стэрэаскапічных відарысаў” (аўтары− вучні 10 класа Давідовіч Уладзіслаў, Пратасевіч Аляксандр,Яскевіч Дзяніс; кіраўнік− Малашэвіч У. Л.) У выніку работа была адзначана дыпломам II ступені.




Навінай сёлета стала анлайн-трансляцыя працы секцыі “Фізіка і астраномія”. Усе жадаючыя праз сетку інтэрнет маглі ў рэальным часе сачыць за выступамі ўдзельнікаў і за абмеркаваннем работ.

Конкурс дазволіў атрымаць ацэнку работ, і парады навукоўцаў, замацаваць навыкі публічных выступленняў, атрымаць новыя ідэі.

Удзельнікам конкурсу была прадстаўлена магчымасць наведаць пляцоўку музея папулярнай навукі “Элемента”, а таксама азнаёміцца з выставай кніг, перыядычных і медыя-выданняў “Вучуся быць навукоўцам” у бібліятэцы інстытута. Кожны ўдзельнік атрымаў на памяць пра конкурс невялікія, але карысныя сувеніры. Вечарам юныя даследчыкі мелі магчымасць наведаць сеанс навукова-фантастычнага фільма “Назад у будучыню – 2”, у якім падзеі адбываюцца 21 кастрычніка 2015 года (а здымаўся фільм у 1989-м.) Прагляд дазволіў параўнаць, што спраўдзілася з навуковых прагнозаў аўтараў фільма, а што – не.